# Інструкцыя па запаўненні электроннай заявы на атрыманне шэнгенскай візы

З 1 сакавіка 2015 года было ўведзена абавязковае запаўненне заявы на атрыманне візы ў электроннай форме, а таксама папярэдняе браніраванне даты і часу падачы дакументаў на старонцы https://ezov.mzv.sk/e-zov/

Заяўнікі маюць магчымасць запоўніць (лацінкай) электронную візавую заяву, гэта значыць пры дапамозе электроннай сістэмы ўнесці ў інтэрнэце даныя, неабходныя для візавай заявы (асабовыя звесткі, інфармацыя пра запланаваную паездку і інш.). Пасля захавання візавай заявы сістэма стварае запоўнены бланк візавай анкеты (у фармаце .pdf) з адпаведным кодам заявы. Заяўніку неабходна раздрукаваць бланк, падпісаць яго і прынесці з сабой разам з астатнімі дакументамі ў консульскі аддзел Пасольства Славакіі ў Мінску для асабістай падачы заявы (Мінск, вул. Валадарскага, 6).

**Дзеянні заяўніка:**

1. Выбраць мову (англійская, нямецкая, французская, іспанская або руская);
2. Выбраць "Заява для атрымання візы", пасля чаго адчыніцца дыялогавае акно з анкетай-заявай, якую неабходна запоўніць лацінскімі літарамі згодна з інструкцыяй (усе пункты). Пасля ўводу ўсіх неабходных звестак заяўнік адпраўляе заяву, націснуўшы на кнопку "Падаць заяву";
3. У выпадку, калі заява не была запоўнена і адпраўлена правільна, кожнай канкрэтнай заяве прысвойваецца пісьмовы код, вылучаны чырвоным колерам;
4. Пад нумарам кода будзе размешчана інфармацыя для заяўніка, якая датычыцца неабходных дакументаў для афармлення візы. Адначасова праграма прапануе выбраць наступныя магчымасці:
    - паказаць запоўненую анкету для візавай заявы ў фармаце .pdf, якую заяўнік павінен раздрукаваць, падпісаць і падаць у консульскі аддзел Пасольства Славацкай Рэспублікі ў Мінску разам з поўным пакетам дакументаў;
    - забраніраваць дату;
    - закрыць дыялогавае акно і завяршыць дзеянні.
5. Для таго каб забраніраваць дату падачы візавай заявы ў консульскім аддзеле, **індывідуальнаму заяўніку** неабходна націснуць кнопку "Забраніраваць дату", пасля чаго адкрываецца дыялогавае акно са спісам дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульстваў, з якога заяўнік павінен выбраць Консульства Славацкай Рэспублікі ў Мінску і пацвердзіць правільнасць выбранай установы, націснуць "ОК";
   **акрэдытаваныя турыстычныя фірмы** пасля завяршэння запаўнення формы не выбіраюць дату і час падачы заявы на візу, бо тэрмін падачы загадзя ўзгадняецца ў консульскім аддзелам;
   **спартыўныя групы, групы,** якія жадаюць наведаць Славакію **з культурнай мэтай** (творчыя калектывы, гурты і г. д.), а таксама ўсе астатнія групы пасля завяршэння запаўнення формы не выбіраюць дату і час падачы заявы на візу, бо тэрмін падачы загадзя ўзгадняецца ў консульскім аддзелам;
6. У календары наведванняў індывідуальнаму заяўніку патрэбна выбраць пэўную дату падачы дакументаў. Пасля выбару даты праграма паказвае свабодныя (незабраніраваныя) даты і час, з якіх заяўнік выбірае варыянт, які яму падыходзіць;
7. Калі індывідуальны заяўнік забраніраваў дату падачы дакументаў, але праз важныя прычыны ў гэты дзень не можа прыйсці ў Пасольства Славакіі, ён можа

перанесці дату падачы заявы на іншы тэрмін. У такім выпадку неабходна ўвесці код візавай заявы і нумар пашпарта.
**Увага!** Неабходнасць асабістай прысутнасці індывідуальнага заяўніка ў час падачы дакументаў застаецца абавязковай.

Калі пры запаўненні электроннай візавай анкеты ў вас узнікаюць праблемы, звярніце ўвагу на наступнае:

- Пры запаўненні пункта пра месца нараджэння неабходна пазначыць толькі канкрэтны населены пункт (горад або вёску), а не раён і вобласць;
- Пункты "Асоба, якая запрашае" і "Кампанія, якая запрашае" не могуць запаўняцца разам. Пункт "Асоба, якая запрашае" павінен запаўняцца ў тым выпадку, калі запрашэнне складзена фізічнай асобай. У выпадку, калі вас запрашае юрыдычная асоба (гэта датычыцца і турыстычных агенцтваў) вы запаўняеце толькі пункт "Кампанія, якая запрашае".
- У выпадку запаўнення заявы для дзіцяці неабходна пазначыць законнага прадстаўніка дзіцяці (аднаго з бацькоў) у адпаведным пункце;
- Магчымасць браніравання тэрміну падачы візавай заявы не датычыцца турыстычных груп, груп, якія жадаюць наведаць Славакію з культурнай мэтай, а таксама ўсіх астатніх груп, якія папярэдне павінны інфармаваць консульскі аддзел пра запланаваную падачу анкет на электронны адрас cons.minsk@mzv.sk

Запаўненне анкеты на атрыманне візы ў электроннай форме не азначае, што заява прынята да разгляду. Заява на атрыманне візы лічыцца прынятай толькі пасля падачы астатніх неабходных дакументаў і аплаты консульскага збору.